УДК 633.2.038 : 631.674.5

М. М. ДАЙНЭКА, А. Г. ХАМЯКОЎ

РЭКАНСТРУКЦЫЯ СТАРАЎЗРОСТАВЫХ ПАШАЎ ШЛЯХАМ ПАДСЯВАННЯ Ў ДЗЯРНІНУ БАБОВЫХ ТРАЎ

Даследаванні па распрацоўцы тэхналогіі падсявання насення бабовых траў у дзярніну сеяных лугоў, якія зараз зводзяцца, упершыню ў рэспубліцы правялі вучоныя БСГА [1].

Навукова-вытворчае аб'яднанне «Белсельгасмеханізацыя» ЦНДІ МЭСГ сумесна з БСГА распрацавалі спецыяльную машыну (сеялку) МД-3,6 для палоснага падсявання насення траў ў дзярніну. Мы ў 1989—1990 гг. праводзілі даследаванні па падсяванні канюшыны з дапамогай гэтай фрэзернай травяной сеялкі. Палявыя доследы закладзены 12 красавіка 1989 г. у калгасе «Красная плошча» Гомельскага раёна на сеянай пашы пятага года карыстання на дзярнова-падзолістай лёгкасуглінкавай глебе. Аграхімічная характарыстыка ворнага гарызонта наступная: pH_{KCl} 5,9, K_2O — 24,5, P_2O_5 — 8,5 мг/100 г глебы, гумус — 2,6%.

У складзе травастою пашы пераважала купкоўка зборная (70% ад усёй масы), а таксама нязначная колькасць аўсяніцы лугавой, каласоўніку безасцюковага, разнатраўя. Злакавыя кампаненты травастою знаходзіліся ў старым генератыўным стане (дыяметр дзярновін 2—3 см, вышыня парасткаў 12—15 см, шчыльнасць асобін купкоўкі зборнай 20—25 на 1 м²).

Фрэзернай травяной сеялкай МД-3,6 у дзярніну падсявалі канюшыну па наступнай схеме (кг): першы варыянт — канюшына паўзучая (3), другі — канюшына паўзучая (4), трэці — канюшына лугавая (4), чацвёрты — канюшына лугавая (5), пяты — унясенне на стараўзроставай пашы без падсявання канюшыны $P_{60}K_{60}$, шосты варыянт — унясенне $N_{90}P_{60}K_{60}$. Дослед уключаў варыянты як з арашэннем, так і без яго. Перад сяўбой глеба правапнавана з разліку 3 т/га вапны.

Сістэма ўгнаення пашы: $P_{60}K_{60}$ — фон, фосфарныя і калійныя ўгнаенні ўносіліся вясной у адзін прыём. Азотныя ўгнаенні на стараўзроставым травастоі — 90 кг/га ўносілі за два разы: вясной пры адрастанні траў 45 кг/га і пасля другога страўлівання пры пашавым выкарыстанні.

Выкарыстанне травастою ў год падсявання бабовых траў заключалася ў пяціразовым страўліванні, а на другі год — у чатырохразовым пры шчыльнасці 200 галоў дойнага статку на 1 га.

Вегетацыйны перыяд (красавік — верасень) у 1989 г. па вільгацезабяспечанасці не дасягнуў сярэдняй шматгадовай велічыні — 369 мм ападкаў: выпала 253,7 мм. Сярэдняя тэмпература паветра за вегетацыйны перыяд склала 16,7 °С, што на 2,3 °С больш за сярэднюю шматгадовую. Адным з асноўных лімітуючых фактараў развіцця шматгадовых траў